*1.* Парад победителей. Книга-альбом. – М.: Региональная культурно-просветительская общественная организация «Атлантида – XXI век», 2006. – 160 с.

*2. Сорокин, А. И.* Навстречу 60-летию Великой Победы [Электронный ресурс] / Журнал «Право и безопасность» № 3–4 (8–9) – Декабрь 2003 г. – Режим доступа: http://dpr.ru/pravo/pravo_6_ogl.htm. – Дата доступа: 10.03.2016.

*3.* Международная выставка «В борьбе против нацизма мы были вместе» [Электронный ресурс] / Обзор СМИ по информационному сопровождению мероприятий Центрального музея Великой Отечественной войны (первое полугодие 2015 года). – М., 2015. – Режим доступа: http://www.poklonnayagora.ru/ord_img/doc/1440428534_04.pdf. – Дата доступа: 10.03.2016.

# АДЛЮСТРАВАННЕ ПАДЗЕЙ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ЭКСПАЗІЦЫЯХ ПРЫСТАСАВАНЫХ ПАД МУЗЕІ БЫЛЫХ СЯДЗІБ

***Д. В. Герасімёнак,***
*аспірант; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

Падзеі Вялікай Айчыннай вайны адлюстроўваюцца практычна ва ўсіх экспазіцыях краязнаўчых музеяў краіны. Апошнія ажыццяўляюць збор дакументаў, матэрыялаў і рэчавых крыніц дадзенай тэматыкі, арганізуюць масавыя мерапрыемствы па азнаямленні з унікальнымі экспанатамі і падзеямі часоў Вялікай Айчыннай, праводзяць педагагічныя заняткі з рознымі катэгорыямі музейных наведвальнікаў.

Дадзены працэс, безумоўна, адбываецца і ў краязнаўчых музеях, якія размешчаны ў былых сядзібах. Да ўласна сядзіб можна аднесці комплексы архітэктурных і прыродных элементаў, што ўключалі ў сябе палацы і сядзібныя дамы, гаспадарчыя і вытворчыя пабудовы, капліцы, сады, паркі, водныя сістэмы, а таксама малыя архітэктурныя формы, аб'яднаныя адзінай логікай планіровачнай структуры. У мінулым сядзібы з'яўляліся найбольш выразнымі культурнымі цэнтрамі грамадскага жыцця, таму і па сённяшні дзень тыя сядзібы, якія захаваліся, таксама адыгрываюць істотную ролю ў сучаснай сацыякультурнай прасторы.

Адзначым, што ў добрым стане захавалася не так шмат сядзіб. А. Т. Федарук у кнізе «Старинные усадьбы Гродненщины» адзначае: «Анализ состояния 270 объектов, выявленных в семи районах Гродненской области показал, что 110 усадеб утрачены... примерно 120 бывших усадеб представлены в настоящее время фрагментами… около 20 усадеб сохранились в прежних границах…» [5, с. 522]. У іншых рэгіёнах сядзібы захаваліся не намнога лепш, калі не горш.

Пэўная колькасць былых сядзіб на тэрыторыі Беларусі выкарыстоўваецца пад краязнаўчыя музеі, экспазіцыі якіх прысвечаны сацыякультурнаму развіццю асобнага рэгіёна ці творчасці мясцовых дзеячаў гісторыі, навукі, культуры, што вызначае спецыфіку іх дзейнасці.

У Рэспубліцы Беларусь існуюць розныя варыянты (формы) прыстасавання, як аднаго з этапаў музеефікацыі, сядзібных комплексаў.

Адным з тыповых прыкладаў такога прыстасавання можа служыць сядзіба купцоў Аўрамавых, якая адносіцца да 2-й паловы XIX ст. У ёй сёння размешчаны Хойніцкі раённы краязнаўчы музей, заснаваны ў 1982 г. на грамадскіх пачатках. У 2010 г. адкрыта сучасная экспазіцыя музея. Знаходзіцца на вуліцы К. Маркса ў сённяшнім цэнтры г. Хойнікі.

Сядзібны дом, паводле А. М. Кулагіна, – помнік эклектычнай архітэктуры, уяўляе з сябе двухпавярховы прамавугольны ў плане мураваны будынак, да якога асіметрычна прыбудавана квадратная вежа. Парк мае пейзажна-рэгулярную планіроўку. Растуць мясцовыя пароды дрэў: асіна, ліпа, клён, лістоўніца [2, с. 348].

Дэманстрацыйная плошча залаў музея – 488,22 м$^2$, 3,5 тыс. адзінак асноўнага фонду. Экспазіцыя падзяляецца на наступныя раздзелы: гісторыя сядзібы; прырода роднага краю; гісторыя і этнаграфія рэгіёна; Вялікая Айчынная вайна; сучасная гісторыя раёна; карцінная галерэя; зала зменных экспазіцый.

Перыяду Вялікай Айчыннай вайны прысвечана экспазіцыя чацвёртай залы музея. Паказаны асноўныя этапы вайны: абарончыя баі на тэрыторыі Хойнiччыны; падпольны і партызанскі рух у гады акупацыі; вызваленне тэрыторыі раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў; вызваленчая місія Чырвонай Арміі ў Еўропе. У вітрынах знаходзіцца інфармацыя аб ветэранах Вялікай Айчыннай вайны – ураджэнцах Хойніцкага раёна і іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асабістыя рэчы; аб воінах, якія прымалі ўдзел і загінулі пры вызваленні г. Хойнікі і Хойніцкага раёна; удзельніках антыфашысцкай падпольнай арганізацыі, што дзейнічала на тэрыторыі Хойніцкага раёна. Экспануецца вайсковы рыштунак, асабістыя рэчы салдат, франтавыя лісты, дакументальныя здымкі [6]. Музей праводзіць сустрэчы з ветэранамі і сведкамі падзей Вялікай Айчыннай вайны.

Другім тыповым прыкладам адлюстравання падзей Вялікай Айчыннай з'яўляецца Пухавіцкі раённы краязнаўчы музей, размешчаны ў аграгарадку Блонь. Музей, заснаваны ў 1968 г. як школьны ў в. Дукора, з 1993 г. размешчаны ў сядзібным доме рэвалюцыянера-народніка А. В. Бонч-Асмалоўскага, што з'яўляецца помнікам правінцыяльнай архітэктуры 2-й паловы XIX ст. Пабудаваны ў стылі позняга класіцызму.

Сядзібны дом уяўляе з сябе аднапавярховы, прамавугольны ў плане будынак, накрыты вальмавым дахам. Парк разбіты абапал ракі. Пачынаецца ад невялікага ручая каля сядзібнага дома. Затым з-за выгіну рэчышча паступова расшыраецца ў паўднёва-заходнім кірунку. Завяршае парк ліпавая алея [3, с. 124].

Плошча экспазіцыі музея – 297 м$^2$, 6,5 тыс. адзінак асноўнага фонду. Мае аддзелы: жыццё і дзейнасць асветнікаў Бонч-Асмалоўскіх; народны побыт краю; населеныя пункты раёна; Вялікая Айчынная вайна; знакамітыя людзі краю; літаратурная Пухаўшчына.

У адрозненне ад Хойніцкага раённага краязнаўчага музея, у ім дастаткова падрабязна адлюстравана гісторыя сям'і Бонч-Асмалоўскіх і іх дзейнасці па арганізацыі народніцкага рэвалюцыйнага руху. Вялікую цікавасць наведвальнікаў выклікае мемарыяльны пакой сям'і.

У раздзеле экспазіцыі музея, што прысвечаны Вялікай Айчыннай, прадстаўлены матэрыялы, якія адносяцца да пачатковага перыяду вайны (зброя, асабістыя рэчы савецкіх воінаў), расказваецца пра ўзнікненне і разгортванне дзейнасці падполля і партызанскага руху ў раёне (лістоўкі «Да працоўных Беларусі» і «Красная Армия идет к нам», падпольная газета «Бальшавіцкі сцяг»). Экспануюцца фатаграфіі, асабістыя рэчы, дакументы, узнагароды партызан. Пра злачынствы нямецка-фашысцкіх захопнікаў у раёне расказваюць фатаграфіі ахвяр фашызму, асабістыя рэчы і прылады працы вязняў лагераў смерці, матэрыялы пра спаленыя разам з жыхарамі вёскі, пра Скобраўскі лагер смерці і інш. Расказваецца аб вызваленні Пухавіцкага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раёна войскамі Чырвонай Арміі. Асобны стэнд прысвечаны землякам – удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку шасці Героям Савецкага Саюза [4, с. 670–671].

Працэс стварэння экспазіцый, што прысвечаны перыяду Вялікай Айчыннай вайны, у былых сядзібах прадаўжаецца. Так, у 2012 г. сядзіба Козел-Паклёўскіх у в. Красны Бераг была перададзена на баланс Жлобінскага гісторыка-краязнаўчага музея, зараз тут плануецца адкрыццё экспазіцыі па гісторыі дадзенага рэгіёна [1].

Такім чынам, відавочна, што ў адлюстраванні падзей Вялікай Айчыннай музеямі, якія размешчаны ў былых сядзібах, існуюць пэўныя аднолькавыя рысы: асвятляецца першапачатковы перыяд вайны; дзейнасць партызанскага падполля пад час нямецкай акупацыі рэгіёна; паказана вызваленне мясцовай тэрыторыі ад нямецкіх акупантаў. Вялікая ўвага надаецца барацьбе ўраджэнцаў рэгіёна супраць фашысцкіх захопнікаў.

Безумоўна, экспазіцыі гэтых музеяў мала ў чым адрозніваюцца ад экспазіцый іншых краязнаўчых музеяў. Хацелася б падкрэсліць, што, з аднаго боку, можна толькі вітаць рацыянальнае прыстасаванне сядзіб пад сучасныя патрэбы грамадства, але, з іншага, пасля музеефікацыі многіх з іх па-за ўвагай пакідаецца каштоўнасць сядзібы як комплексу архітэктурных, ландшафтных, гаспадарчых пабудоў. У сядзібным доме, як правіла, часткова, прычым сучаснымі будаўнічымі матэрыяламі і тэхналогіямі, узнаўляецца аўтэнтычнае абсталяванне жылога дома. Парк, малыя архітэктурныя формы аднаўляюцца як аб'екты рэкрэацыі, а не як помнікі гісторыі і культуры.

Тым не менш, такія сядзібныя комплексы з'яўляюцца асновай фарміравання культурна-гістарычнага асяроддзя рэгіёна, самаідэнтыфікацыі мясцовага соцыуму, сродкам патрыятычнага выхавання насельніцтва. Яны больш шырока раскрываюць значэнне рэгіянальнай культуры, зберагаюць памяць аб мінулым, даюць адлюстраванне падзей Вялікай Айчыннай вайны – адзін з найважнейшых напрамкаў дзейнасці па захаванні і актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны ўсёй краіны і канкрэтнага рэгіёна.

*1.* ГУК «Жлобинский историко-краеведческий музей» – История музея [Электронный ресурс] // Музеи Гомельской области. – Режим доступа: http://museum.gomel-region.by/ru/list/zhlobin/zhlobin_history_ museum/. – Дата доступа: 14.04.2015.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гомельская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелСЭ, 1985. – 383 с. : іл.

3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелСЭ, 1987. – 308 с. : іл.

4. Памяць: Пухав. р-н: Гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / укл. А. А. Пpановіч ; рэдкал.: А. М. Карлюкевіч [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Беларусь, 2003. – 749 с. : іл.

5. *Федорук, А. Т.* Старинные усадьбы Гродненщины: Волковысский район, Вороновский район, Гродненский район, Дятловский район, Зельвенский район, Ивьевский район / А. Т. Федорук ; [научный редактор О. Н. Попко]. – Минск : Беларусь, 2014. – 543 с.

6. Хойникский районный краеведческий музей (Гомельская область) [Электронный ресурс] // Экскурсии бай. – Режим доступа: http://www.ekskursii.by/?museum=2066. – Дата доступа: 16.04.2015.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ОСОБЕННОСТИ РАЗВИТИЯ ТЕАТРАЛЬНОГО ИСКУССТВА СЕВЕРНОГО ПРИАЗОВЬЯ В 1943–1945 гг.

***О. А. Демидко,***
*аспирант; Мариупольский государственный университет*

Изучение проблемы Второй мировой войны и ее решающей части – Великой Отечественной – постоянно находится в центре научных исследований. Определенную роль в победе советского народа сыграла культура, ее влияние на морально-психологическое настроение советских людей. В связи с этим особую значимость приобретает изучение деятельности советских театров на освобожденной территории. Театральная культура в военное время остается до сих пор недостаточно изученной в исторической и культурологической литературе и одновременно служит наиболее важным фактором идеологического, воспитательного и мобилизующего воздействия.

Цель данной публикации – исследовать особенности развития театрального искусства Северного Приазовья на заключительном этапе Великой Отечественной войны в 1943–1945 гг. Информация о восстановлении деятельности театра Северного Приазовья фрагментарно содержится в работах Е. Тонконог [5], В. Черникова [6], Л. Чуприк [7], Л. Яруцкого [8]. Отсутствие комплексного культурологического исследования по выб-